# Камандніму, палітычнаму і чырвонаармейскаму складу 6 кавалерыйскага корпуса імя Сталіна

Няма ні вялікай ні малой справы ў нашай цудоўнай краіне, з якою не было-б звязана імя Сталіна. Няма такога сэрца рабочага і калгасніка, працоўнага, савецкага інтэлігента, якое пры імені Сталіна не забілася-б гарачэй, упэўненей, адстукваючы ўчашчоны рытм жыцця і барацьбы, вялікіх і малых спраў будаўніцтва соцыялізма. Няма ні аднаго імені Героя Совецкага Саюза, ордэнаносца, знатнага чалавека краіны і актывіста партыі і комсамола, гераічныя слаўныя справы якіх не натхняліся-б іменем, клопатамі і любоўю Сталіна.

Усё вялікае і малое, усё працалюбівае і чэснае, усё знатнае і гераічнае — увесь цудоўны совецкі народ — сотнямі мільёнаў людзей і спраў аб'ядналася і ўвасобілася ў імені Сталіна.

Атрымаць права насіць гэта імя — імя вялікага Сталіна — гэта такая чэсць, такая слава, роўнай якой у нас, у Краіне соцыялізма, няма.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы